Да 110-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка Леаніда Прокшы (1912 – 1994) у зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з **1 красавіка** працуе выстава **«З добрым набыткам»**. Леанід Прокша плённа працаваў у жанры сатырычнай і гумарыстычнай прозы, пісаў на беларускай, рускай і польскай мовах. Вастрынёй гумару вызначаюцца яго памфлеты, фельетоны, апавяданні, гумарэскі, сатырычныя замалёўкі. Пісьменнік у сваёй творчасці адгукаўся на самыя надзённыя праблемы жыцця, звяртаўся да актуальных сацыяльных тэм, выкрываў маральныя заганы людзей, уздымаў праблемы агульначалавечых каштоўнасцяў, норм і правіл грамадства. Апісаныя сатырыкам гісторыі вызначаюцца цікавасцю, запамінальнасцю, рэалістычнасцю характараў герояў, падрабязнасцю

бытавых дэталяў. На выставе прадстаўлены зборнікі апавяданняў і нарысаў, гумарыстычных апавяданняў і памфлетаў, выданні прозы і публіцыстыкі, а таксама кнігі для дзяцей. Дапаўняюць яе творы пісьменніка, апублікаваныя на старонках перыядычных выданняў і ў калектыўных зборніках, матэрыялы пра яго жыццё і творчасць.

Выстава працуе па 17 мая.